коммуникация» / Т.Г. Грушевицкая, В.Д. Попков, А.П. Садохин; под ред. А.П.Садохина. – М. : ЮНИТИ-ДАНА, 2002. – 352 с.

3. Верещагин, Е. М. Язык и культура : лингвострановедение в преподавании рус. яз. как иностранного : метод. руководство / Е.М. Верещагин – М. : Рус. яз., 1990. – 246, [1] с.

4. Чернявская, Ю.В. Народная культура и национальные традиции : пособ. для учителей / Ю. В. Чернявская. – Минск : Беларусь, 2000. – 199 с.

**Аднашовіна В.В.,** студ. 204 гр.
Навуковы кіраўнік – Бабко А.І.

## ФІЛАСОФСКАЯ ГЕРМЕНЕЎТЫКА І ЯЕ МЕТАДАЛАГІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ Ў КАНТЭКСЦЕ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Існуе мноства падыходаў да вывучэння культуры: антрапалагічны, семіятычны, дзейнасны, аксіялагічны і іншыя. Філасофская герменеўтыка таксама аказала ўплыў на вывучэнне культуры і на яе аснове сфарміраваўся герменеўтычны падыход. Дадзены падыход з'яўляецца надзвычай важным, бо ад разумення культурных феноменаў залежыць ўспрыманне пэўнай культуры, разуменне яе спецыфікі і традыцый.

Каб зразумець, што такое герменеўтыка і якую ролю яна адыгрывае ў культуралагічных даследаваннях, трэба прасачыць яе зараджэнне, развіццё і працэс станаўлення як самастойнай навукі на сучасным этапе.

Этымалагічна ―герменеўтыка" ўзыходзіць да слоў ―растлумачваць", ―тлумачыць". Карані яе ўзнікнення сыходзяць у Антычнасць і звязаны з старажытнагрэцкім богам Гермесам, асноўная задача якога заключалася ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

данясенні і тлумачэнні волі багоў простым людзям. Далейшае развіццё герменеўтыка атрымала ў Сярэднявечча. У гэтую эпоху яна ўжывалася для тлумачэння тэкстаў Святога Пісання. У эпоху Адраджэння герменеўтыка была звязана з аднаўленнем гістарычнага кантэксту думкі, а таксама з тлумачэннем незразумелых слоў. Падчас Асветы герменеўтыка служыла для пераадолення гістарычнай дыстанцыі, якая існуе паміж аўтарам і інтэрпрэтатарам.

Затым, у XIX стагоддзі пачалося зараджэнне сучаснай філасофскай герменеўтыкі і звязана яно з імем нямецкага філосафа-тэолага Фрыдрыха Шлейермахера. Ён разумее герменеўтыку як мастацтва разумення іншага чалавека, яго індывідуальных якасцей. Прадметам такога разумення, па Шлейермахеру, становіцца тэкст. Разуменне тэкстаў носіць дваістую прыроду – з аднаго боку, адбываецца даследаванне мовы тэксту, які, у сваю чаргу, з'яўляецца элементам агульнай моўнай сістэмы, а з другога боку, тэкст ствараецца суб'ектам, які ўкладвае ў яго свае ідэі. Зыходзячы з гэтага, Шлейермахер вылучае два спосаба інтэрпрэтацыі – аб'ектыўную і тэхнічную, якой ён аддае перавагу [3, с. 176]. Пад тэхнічнай, або суб'ектыўнай інтэрпрэтацыяй ён разумее ўваходжанне, ужыванне ў душэўны свет стваральніка тэксту.

Пасля Шлейермахера істотны ўплыў на станаўленне філасофскай герменеўтыкі як навукі аказаў Вільгельм Дзільтэй. Ён разумеў герменеўтыку як адмысловую філасофскую дысцыпліну, якая з'яўляецца своеасаблівай метадалогіяй гуманітарных навук. Дзільтэй надае ўвагу паняццю культурна-гістарычнай рэаліі і сцвярджае, што чалавек мае гістарычную натуру. Кажучы пра разуменне, ён дае яму лагічныя характарыстыкі, а таксама асаблівае месца надае перажыванню, якое, на яго думку, вызначае ўспрыманне свету чалавекам. Таксама Дзільтэй лічыць, што герменеўтыка можа служыць не толькі для разумення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выключна тэксту, а для ўсіх праяў чалавечай духоўнасці. Зразумець свой унутраны свет чалавек можа шляхам інтраспекцыі – працэсу саманазірання. А вось свет іншага чалавека пазнаецца шляхам уваходжання у яго праз пачуцці. Дзільтэй даводзіць аб важнай ролі мовы, дзякуючы якой даследчыкі могуць вылучыць спосабы разумення, бо менавіта мова ўплывае на перадачу і ўспрыманне інфармацыі аб свеце, таму людзі пэўнай культуры, аб'яднаныя агульнай мовай, значна хутчэй зразумеюць тое, што для носьбітаў іншай культуры будзе зразумець складаней [1. с. 191] .

Заснавальнікам філасофскай герменеўтыкі з'яўляецца Ганс-Георг Гадамер. Ён разглядаў герменеўтыку хутчэй не як вучэнне пра метад разумення, а як анталогію. Гадамер імкнецца раскрыць у герменеўтыцы не толькі гнасеалагічныя бок, але таксама ўключыць у яе пытанні пра дух, сэнс жыцця. Ён таксама сцвярджае, што герменеўтыка можа паслужыць для стварэння новага культурнага тэксту пры кожным новым прачытанні і інтэрпрэтацыі чытачом. У сваёй працы ―Ісціна і метад” ён падымае праблему разумення. Для разумення недастаткова таго, каб чытач стаў на месца аўтара, іх погляды павінны сустрэцца і ўтварыць новы сэнс. Гадамер гаворыць пра тое, што чытач павінны быць адкрытым для іншага разумення: ”Требуется только открытость к мнению другого или текста. Однако такая открытость изначально предполагает, что мы приводим чужое мнение в соответствие с целостностью наших собственных мнений или наоборот” [2, с. 319]. Гадамер вылучае трэці кампанент, неабходны для разумення – мова, якая зможа прымірыць пункты гледжання аўтара і інтэрпрэтатара. Менавіта пры дапамозе мовы можа адбывацца дыялог паміж рознымі культурамі. Мова з'яўляецца таксама асаблівай умовай пазнання чалавечай дзейнасці. Гадамер сцвярджае, што сэнс з'яўляецца ініцыятарам разумення. Ён пераасэнсоўвае ролю і значэнне папярэдняга

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

меркавання. Яно не нясе ў яго негатыўнай афарбоўкі, а наадварот, мае станоўчы характар. Гадамер сцвярджае, што папярэдняе меркаванне спрыяе разуменню. Папярэдняе меркаванне – гэта меркаванне, якое існуе перад глыбокім разуменнем нейкай з'явы ці прадмета, і яно замацавана ў традыцыі культуры. Такім чынам, разумеючы папярэдняе меркаванне, чалавек разумее традыцыю, а значыць разумее спецыфіку таго часу, да якога належыць аб'ект разумення.

Філасофская герменеўтыка імкнецца вырашыць праблему суб'ектна-аб'ектных адносін, яна не пазбягае анталагічных праблем. Спазнаць быццё можна толькі пры паглыбленні і пашырэнні спазнанняў чалавечага свету. Вылучаная Гадамерам ідэя аб станоўчым характары папярэдніх меркаванняў з'яўляецца найбольш актуальнай і значнай для сучасных культуралагічных даследаванняў. Пераадоленне негатыўнага стаўлення да папярэдніх меркаванняў спрыяе пераадоленню адмоўных тэндэнцый, якія ўзніклі ў грамадстве ў сувязі з няправільнай інтэрпрэтацыяй гэтага паняцця і якія вялі ў канчатковым выніку да ўскладнення дыялогу паміж рознымі культурамі. Уклад Гадамера ў герменеўтычны аналіз культурных тэкстаў заключаецца ў тым, што трансфармацiя адносін да паняцця папярэдніх меркаванняў паспрыяла больш глыбокаму разуменню і тлумачэнню гэтых тэкстаў. Герменеўтыка спрыяла ўсталяванню найбольш плённых адносін паміж аўтарам і інтэрпрэтатарам, якія грунтуюцца на ўзаемапранікненні. Інтэрпрэтатар разумее сэнс і на аснове разумення распрацоўвае сваю інтэрпрэтацыю сэнсу і сутнасці справы, ў выніку дася-гаецца згода паміж аўтарам і інтэрпрэтатарам. Толькі праз злучэнне гэтых сэнсаў пры дапамозе герменеўтычнага вопыту паўстане сапраўдны сэнс.

Адсюль вынікае неабходнасць звароту да герменеўтычнага вопыту, герменеўтычнай метадалогіі і тэорыю. Гэта дапаможа свабодна ўжываць дадзены метад на сучасным этапе, даследчыкі могуць свабодна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэрпрэтаваць як сучасныя тэксты, так і тэксты папярэдніх эпох, знаходзіць ўзаемасувязь паміж імі і прагназаваць далейшае развіццё культуры.

У дадзеным даследаванні мы прасачылі шлях развіцця герменеўтычных ведаў ад метаду даследавання да самастойнай дысцыпліны. Разгледзеўшы розныя канцэпцыі прадстаўнікоў філасофскай герменеўтыкі, можна сцверджаць, што як метад даследвання яна адыгрывае важную ролю, асабліва на сучасным этапе развіцця культуры, у якім асаблівае месца належыць дыялогу, калі неабходна ведаць асаблівасці традыцый і менталітэту прадстаўнікоў розных культур.

---

1. Алексеев, П.В. Философия : учебник. 3-е изд. перераб. и доп. / П.В. Алексеев., А.В. Панин. – М. : Проспект, 2003. – 608 с.

2. Гадамер, Г.-Г. Истина и метод: Основы философской герменевтики / Г.-Г. Гадамер; общ. ред. и вступ. ст. Б.Н. Бессонова. – М. : Прогресс, 1988. – 704 с.

3. Спиркин, А.Г. Философия : учебник. 2-е изд. / А.Г. Спиркин. – М. : Гардарики, 2004. – 736 с.

**Алдушина А.Ю.,** студ. 304 гр.
Научный руководитель – Игнатович П.Г.

## ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОЕ НАСЛЕДИЕ

Историко-культурным наследием является совокупность отличительных итогов и свидетельств исторического и духовного развития народа, воплощенных в историко-культурных ценностях. Наследие питает современную науку, образование, культуру. Наравне с природным богатством это главное основание для национального самоуважения и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ